Гродзенская вобласць

# Праект "Памяць аб вайне адгукаецца ў сэрцы"

Упраўленне адукацыі Гродзенскага абласнога выканаўчага камітэта
Аддзел адукацыі, спорту і турызму Зэльвенскага раённага выканаўчага камітэта
Дзяржаўная ўстанова адукацыі “Цэнтр творчасці дзяцей і моладзі г.п. Зэльва”

# *Праект “Памяць аб вайне адгукаецца ў сэрцы”*

Г.п. Зэльва
2015

Рэцэнзент:
дырэктар дзяржаўнай установы адукацыі
“Цэнтр творчасці дзяцей і моладзі г.п. Зэльва”
С.Ц. Багдановіч

Аўтар-складальнік:
намеснік дырэктара па вучэбна-выхаваўчай рабоце А.Ю. Цярэшчанка

Рэкамендавана
метадычным саветам дзяржаўнай установы адукацыі
“Цэнтр творчасці дзяцей і моладзі г.п. Зэльва”
“16” снежня 2014 г., пратакол № 3

**Памяць аб вайне адгукаецца ў сэрцы** / аўтар-склад. А.Ю. Цярэшчанка : Цэнтр творчасці дзяцей і моладзі г.п. Зэльва, 2015. – 50 с.

У брашуры прадстаўлены вопыт работы педагагічнага калектыву па рэалізацыі комплекснага падыходу грамадзянска-патрыятычнага выхавання.

Брашура ўключае апісанне сістэмы работы ў вышэйадзначаным накірунку, распрацоўкі выхаваўчых мерапрыемстваў, творчыя работы, фотагалерэю работ навучэнцаў.

Адрасуецца намеснікам дырэктара па выхаваўчай рабоце, метадыстам, педагогам устаноў дадатковай адукацыі.

© Дзяржаўная ўстанова адукацыі “Цэнтр творчасці дзяцей і моладзі г.п. Зэльва”

## Змест


Уводзіны……………………………………………………………….. 4
Інфармацыйная карта праекта…………………………..…........... 6
Актуальнасць праекта………………………………….………… 8
Каляндарны план мерапрыемстваў па рэалізацыі праекта……….…. 11
Практычны аспект рэалізацыі праекта………………………………….. 14
Заключэнне ………………………….………………………… 22
Літаратура………………………………..……………………..… 23
Дадатак 1. Палажэнне аб правядзенні раённай акцыі “Добрае сэрца” – ветэранам!” па аказанні шэфскай дапамогі ветэранам Вялікай Айчыннай вайны ……………..…………………………………. 24
Дадатак 2. План правядзення ўрачыстых мерапрыемстваў, прысвечаных Дню юнага героя-антыфашыста (8 лютага 2014 г.) і 70-годдзю вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў ……………..…………………………………… 27
Дадатак 3. Інтэрнэт-віктарына “Юныя піянеры героі-антыфашысты”.. 28
Дадатак 4. Сценарий агитбригады тимуровского отряда «Надежда» государственного учреждения образования «Учебно-педагогический комплекс Мижеричский детский сад – базовая школа им. В. Ляха» «Тимуровцы сегодняшнего дня» …………… 30
Дадатак 5. Інтэрнэт-віктарына “Перагортваючы старонкі гісторыі Зэльвеншчыны” ……………………………………..…………… 35
Дадатак 6. Каталог работ па выніках плэнера, прысвечанага Дню Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне «Подзвігу народа прысвячаецца» ……………………………………..……………… 39
Дадатак 7. Творческая работа «Мой прадед» ……………..………… 41
Дадатак 8. Проект «Эсминец "Разумный"» ……..……………………… 44
Дадатак 9. “Два народа – одна память” (статья из районной газеты “Праца” от 19.02.2014 г.) ……………………………………...……….. 50

## Уводзіны

Паводле Канцэпцыі непарыўнага выхавання дзяцей і навучэнскай моладзі ў Рэспубліцы Беларусь, адной з важнейшых састаўных частак працэса выхавання з’яўляецца фарміраванне і развіццё грамадзянска-патрыятычных пачуццяў і пазіцыі навучэнцаў праз актывізацыю сацыяльна значнай дзейнасці.

У Пасланні Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А.Р. Лукашэнкі беларускаму народу і Нацыянальнаму сходу 23 красавіка 2009 года адзначалася, што эканамічнае адраджэнне нашай краіны не можа адбыцца без грамадзянскага станаўлення кожнага чалавека. Ад таго, наколькі чалавек адчуў сябе чалавекам, усвядоміў сваю прыналежнасць да таго, што адбываецца, адказнасць за лёс Айчыны, ад яго каштоўнасных арыентацый і светаўспрымальных установак залежыць змест, характар, накірунак сацыяльна-эканамічнага і палітычнага развіцця Рэспублікі Беларусь. Сёння свет прыйшоў да разумення таго, што падставай рашэння глабальных эканамічных і сацыяльных праблем з’яўляецца разуменне таго, што свету неабходны чалавек самастойны, свабодны і культурны.

Грамадзянска-патрыятычнае выхаванне фарміруе не проста законапаслухмянага грамадзяніна, а чалавека, які разумее і актыўна выконвае свой грамадзянскі доўг. Яно змяшчае ў сабе прывіцце павагі да Дзяржаўнага сцяга і герба Рэспублікі Беларусь, гераічнага і гістарычнага мінулага, культуры свайго народа, любові да роднай мовы, прыгажосці роднай прыроды, змяшчае ў сабе экалагічнае выхаванне. І, нарэшце, садзейнічае яднанню ўсіх грамадзян краіны незалежна ад нацыянальнай прыналежнасці, палітычных або рэлігійных перакананняў, яно кансалідуе грамадства ў імя росквіту Беларусі.

Толькі на аснове высокіх пачуццяў патрыятызму і нацыянальных святынь умацоўваецца любоў да радзімы, узнікае пачуцце адказнасці за яе магутнасць і незалежнасць, захаванне матэрыяльных і духоўных каштоўнасцей, развіваецца годнасць асобы.

Выхаванне грамадзяніна – адна з краевугольных задач сучаснай установы адукацыі. Актуальнасць дадзенай тэмы раскрываецца ў стварэнні адзінай выхаваўчай сістэмы, якая садзейнічае паглыбленаму знаёмству з айчыннай гісторыяй і культурай, традыцыямі і дасягненнямі краіны.

Такім чынам, каб пераадолець сацыяльную абыякавасць, выхаваць у навучэнцаў патрыятызм, любоў да Радзімы, грамадзянскую адказнасць за дзяржаву, каб вырасціць грамадзян, якія неабыякавыя да лёсу свайго народа, педагогам, па-першае, трэба памятаць пра неабходнасць і першачарговую важнасць арганізацыі грамадзянска-патрыятычнага выхавання; па-другое, стварыць канкрэтныя ўмовы, пры якіх яно будзе магчыма.

Велізарныя магчымасці ў вырашэнні дадзенага пытання належаць і ўстановам дадатковай адукацыі. Менавіта праз дзейнасць такіх устаноў існуе магчымасць выхоўваць патрыёта і грамадзяніна не на абстрактных ідэалах, а на дакладных прыкладах, на далучэнні навучэнцаў да гістарычнай і культурнай

спадчыны "малой радзімы". Толькі ведаючы свае карані чалавек можа стварыць сваё светлае будучае.

У брашуры прадстаўлены вопыт работы педагагічнага калектыву дзяржаўнай установы адукацыі "Цэнтр творчасці дзяцей і моладзі г.п. Зэльва" па рэалізацыі комплекснага падыходу грамадзянска-патрыятычнага выхавання, выкарыстанню эфектыўных форм супрацоўніцтва яго ўдзельнікаў.

Брашура рэкамендавана намеснікам дырэктара па выхаваўчай рабоце ўстаноў адукацыі, метадыстам устаноў дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі.

## Інфармацыйная карта праекта

| | |
|---|---|
| **Назва праекта** | «Памяць аб вайне адгукаецца ў сэрцы» |
| **Аўтар праекта** | Цярэшчанка Алена Юр'еўна, намеснік дырэктара па вучэбна-выхаваўчай рабоце |
| **Установа адукацыі** | Дзяржаўная ўстанова адукацыі "Цэнтр творчасці дзяцей і моладзі г.п. Зэльва" |
| **Кантактныя дадзеныя** | Адрас: Гродзенская вобласць, г.п. Зэльва, вул. Савецкая, 10, тэл. 8-01564-24119 |
| **Геаграфія праекта** | Тэрыторыя Зэльвенскага раёна |
| **Удзельнікі праекта** | Навучэнцы ўстаноў адукацыі раёна, педагогі, члены піянерскіх дружын, ПА ГА "Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі", члены Маладзёжнага парламента пры Зэльвенскім раённым Савеце дэпутатаў, грамадскасць |
| **Падтрымка праекта** | Аддзел адукацыі, спорту і турызму Зэльвенскага райвыканкама, аддзел ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Зэльвенскага райвыканкама, раённы савет піянерскай арганізацыі "Ветразь", Маладзёжны парламент пры Зэльвенскім раённым Савеце дэпутатаў, установы агульнай сярэдняй адукацыі |
| **Абгрунтаванне актуальнасці праекта** | Прайшло шмат гадоў з той страшнай вайны, зараслі акопы і варонкі, падняліся з руінаў гарады і вёскі, але памяць пра той час не сыходзіць з сэрца. Людзі зноў і зноў вяртаюцца ў памяці да тых далёкіх, напоўненых цяжарам і вялікай мужнасцю ваенным гадам. Памяць пра вайну хвалюе не толькі ветэранаў, але і падрастаючае пакаленне. Вайна і Перамога – не толькі гісторыя, гэта факт маральнага подзвігу савецкіх людзей, якія прынялі на сябе галоўны цяжар у барацьбе з фашызмам, годна і мужна выканалі свой святы абавязак. Наступствы мінулай вайны адчувальныя і сёння. Таму вельмі важна захаваць у памяці тое, што мы ведаем пра вайну, пра ўдзельнікаў вайны і працаўнікоў тылу. Для дасягнення гэтых мэт і распрацаваны праект «Памяць аб вайне адгукаецца ў сэрцы». |
| **Мэта і задачы праекта** | З мэтай забеспячэння непарыўнасці грамадзянска-патрыятычнага выхавання і ў сувязі са святкаваннем 70-годдзя вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і Вялікай Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне быў распрацаваны праект "Памяць аб вайне адгукаецца ў сэрцы".<br>Рэалізацыя пастаўленай мэты залежыць ад выканання канкрэтных задач: |

| | |
|---|---|
| | – праводзіць работу па падрыхтоўцы і правядзенню мерапрыемстваў, прысвечаных памятным датам Вялікай Айчыннай вайны;<br>– фарміраваць уяўленні аб гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, выкарыстоўваючы розныя віды дзейнасці;<br>– абуджаць інтарэс да мінулага свайго пасёлка, раёна, краіны;<br>– павышаць узровень духоўна-маральнага і патрыятычнага выхавання, сацыяльнай і грамадскай адказнасці. |
| **Кароткі змест праекта** | Праект «Памяць аб вайне адгукаецца ў сэрцы» накіраваны на годную сустрэчу 70-й гадавіны Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. Распрацаваны і рэалізуецца пад кіраўніцтвам дзяржаўнай установы адукацыі “Цэнтр творчасці дзяцей і моладзі г.п. Зэльва”. Праект змяшчае комплекс мер па захаванню і ўвекавечванню памяці аб вайне і яе ахвярах. |
| **Тэрміны рэалізацыі праекта** | 2014-2015 гады |
| **Чакаемыя вынікі** | Рэалізацыя праекта будзе садзейнічаць:<br>– павышэнню ў дзяцей узроўню пачуцця патрыятызму, ашчадных адносін да гісторыі сваёй краіны;<br>– выхаванню павагі да ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны;<br>– далучэнню да розных формаў грамадзянска-патрыятычнага выхавання;<br>– арганізацыі такіх прыцягальных форм дасуга навучэнцаў, якія садзейнічаюць прафілактыцы асацыяльных паводзін. |

## Актуальнасць праекта

У жыцці кожнага народа ёсць лёсавызначальныя даты, якія становяцца кропкай адліку новага этапу гісторыі. Для Беларусі такімі вехамі сталі дзень вызвалення сталіцы нашай краіны і дзень Перамогі, 70-годдзе якіх мы ўрачыста адзначаем у 2014-2015 гадах.

За гады Вялікай Айчыннай вайны Беларусь панесла вялікія страты, згубіўшы трэць сваіх жыхароў, але зламаць маральны дух беларускага народа, яго волю да супраціўлення ворагам так і не ўдалося.

Памяць пра гераічны подзвіг святая. Менавіта яна дапамагае нам не дапушчаць трагічных памылак, а рэальна ацэньваць пагрозы і браць сур'ёзныя ўрокі з мінулага. Ёсць гістарычныя падзеі, над якімі час не ўладае. У іх шэрагу – Вялікая Айчынная вайна.

Вайна… Веха ў гісторыі Айчыны – і трагедыя ў лёсах краін і народаў. Вайна – гэта ўвасобленае зло. І ўвесь вопыт чалавецтва гаворыць толькі пра тое, што толькі памяць можа папярэдзіць страшныя сутыкненні ў будучым. Кожны павінен разумець гэта. І памятаць. І перадаваць эстафету памяці новым пакаленням. Каб і яны – памяталі.

У 2015 г. спаўняецца важная дата – 70-годдзе Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. Патрыятычнае выхаванне падрастаючага пакалення заўсёды з'яўлялася адной з важнейшых задач грамадства. Дзяцінства – самая спрыяльная пара для прывіцця пачуцця любові да Радзімы.

У Зэльвенскім раёне важнае значэнне надаецца грамадска-патрыятычнаму выхаванню, умацаванню сяброўства, выхаванню талерантнасці.

Грамадзянска-патрыятычнае выхаванне ў нашым Цэнтры творчасці з'яўляецца планавым, сістэмным, пастаянным і адным з прыярытэтных напрамкаў у выхаваўчай дзейнасці ўстановы.

Пры арганізацыі грамадзянска-патрыятычнага выхавання мы лічым неабходным:

– узбройваць падрастаючае пакаленне базавымі ведамі аб сусветнай і нацыянальнай культуры;

– сфарміраваць нацыянальную самасвядомасць, матывацыю да самаразвіцця ў свеце культуры;

– развіваць у кожным навучэнцы гістарычную памяць, патрыятычныя, грамадзянскія і маральныя якасці;

– закладваць патрыятычныя асновы і ўменні, неабходныя для ўзнаўлення розных элементаў культуры ў жыццядзейнасці навучэнцаў;

– садзейнічаць развіццю талерантнасці, выхаванню добразычлівых адносін да людзей іншых нацыянальнасцей.

Для нашых педагогаў у патрыятычным выхаванні навучэнцаў важнымі з'яўляюцца наступныя пазіцыі:

– памяць аб тым, што сапраўдны патрыятызм змястоўны, прадметны, бескарыслівы; сістэмнасць і цэласнасць работы;

– гуманістычны падыход да маральнай арганізацыі адукацыйнага працэсу кожным педагогам;

– дыялогавыя метады;

– паважныя адносіны да дзяцей і адзін аднаго;

– узаемадзеянне з соцыумам.

Вырашаючы праблему грамадзянскага выхавання, намаганні перш за ўсё неабходна засяроджваць на фарміраванні ў навучэнцаў каштоўнасных адносін да з’яў грамадскага жыцця.

Паводле дыягностыкі сфарміраванасці патрыятызму старэйшых школьнікаў былі атрыманы наступныя вынікі:

– ва ўстановах адукацыі найбольш часта праводзіцца работа з ветэранамі Вялікай Айчыннай вайны і працы, ладзяцца з імі сустрэчы (73% рэспандэнтаў);

– амаль 67% апытаных адзначылі правядзенне мерапрыемстваў, прысвечаных памятным датам і падзеям; значна больш чалавек (85% рэспандэнтаў) адзначыла стварэнне экспазіцый, прысвечаных ваенным падзеям, а таксама арганізаваныя ў музеі экскурсіі;

– 87% школьнікаў удзельнічаюць у мерапрыемствах патрыятычнага характару, 13% не ўдзельнічаюць у іх;

– 62% апытаных выказалі гатоўнасць выканаць свой грамадзянскі абавязак і пайсці служыць у войска, 31% яшчэ не маюць сталай пазіцыі па гэтаму пытанню, і 7% увогуле не збіраюцца ісці ў армію.

Такім чынам, нягледзячы на разнастайнасць форм і метадаў выхавання, работа ў дадзеным накірунку заўсёды будзе прыярытэтнай.

З *мэтай* забеспячэння непарыўнасці грамадзянска-патрыятычнага выхавання і ўсувязі са святкаваннем 70-годдзя вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і Вялікай Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне быў распрацаваны праект “Памяць аб вайне адгукаецца ў сэрцы”.

Рэалізацыя пастаўленай мэты залежыць ад выканання канкрэтных *задач*:

– праводзіць работу па падрыхтоўцы і правядзенню мерапрыемстваў, прысвечаных памятным датам Вялікай Айчыннай вайны;

– фарміраваць уяўленні аб гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, выкарыстоўваючы розныя віды дзейнасці;

– абуджаць інтарэс да мінулага свайго пасёлка, раёна, краіны;

– павышаць узровень духоўна-маральнага і патрыятычнага выхавання, сацыяльнай і грамадскай адказнасці.

*Праект разлічаны на 2014-2015 гады.*

*Удзельнікі праекта:* навучэнцы ўстаноў адукацыі раёна, педагогі, члены піянерскіх дружын, ПА ГА “Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі”, члены Маладзёжнага парламента пры Зэльвенскім раённым Савеце дэпутатаў, грамадскасць.

Рэалізацыя праекта ажыццяўляецца пры падтрымцы аддзела адукацыі, спорту і турызму Зэльвенскага райвыканкама, аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Зэльвенскага райвыканкама, раённы савет

піянерскай арганізацыі “Ветразь”, Маладзёжнага парламента пры Зэльвенскім раённым Савеце дэпутатаў, установ агульнай сярэдняй адукацыі.

*Этапы рэалізацыі праекта:*

1-ы – падрыхтоўчы (лістапад-снежань 2013 г.).

2-і – старт праекта (студзень 2014 г.).

3-і этап – асноўны (студзень 2014 г. – лістапад 2015 г.).

4-ы – аналітычны (лістапад 2015 г.).

5-ы этап – падвядзенне вынікаў праекта (снежань 2015 г.).

*Геаграфія праекта.*

Праект рэалізуецца на тэрыторыі Зэльвенскага раёна.

*Чакаемыя вынікі.*

Рэалізацыя праекта будзе садзейнічаць:

– павышэнню ў дзяцей узроўню пачуцця патрыятызму, ашчадных адносін да гісторыі сваёй краіны;

– выхаванню павагі да ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны;

– далучэнню да розных формаў грамадзянска-патрыятычнага выхавання;

– арганізацыі прыцягальных форм дасуга навучэнцаў, што садзейнічаюць прафілактыцы асацыяльных паводзін.

## Каляндарны план мерапрыемстваў па рэалізацыі праекта

| № | Мерапрыемства | Тэрмін |
|---|---|---|
| **1.** | **Падрыхтоўчы этап** | |
| 1.1. | Стварэнне творчай групы па распрацоўцы праекта | Лістапад – снежань 2013 г. |
| 1.2. | Вывучэнне нарматыўнай прававой базы | |
| 1.3. | Распрацоўка праекта | |
| 1.4. | Пошук партнёраў | |
| **2.** | **Старт праекта** | |
| 2.1. | Інфармаванне ўдзельнікаў і партнёраў праекта | Студзень 2014 г. |
| 2.2. | Забяспячэнне ўдзельнікаў праекта нарматыўнай і прававой дакументацыяй па рэалізацыі праекта | |
| **3.** | **Асноўны этап** | |
| 3.1. | Акцыя «Добрае сэрца» – ветэранам!» па аказанні шэфскай дапамогі ветэранам Вялікай Айчыннай вайны сіламі цімураўскіх і валанцёрскіх атрадаў (дадатак 1) | 2014 г., 2015 г. |
| 3.2. | Чэмпіянат па інтэлектуальных гульнях сярод піянерскіх дружын «Мая Радзіма – Беларусь!» | Студзень 2014 г. |
| 3.3. | Працоўная акцыя па зборы макулатуры і металалому «Наша піянерская праца табе, Айчына!» | Студзень 2014 г. – май 2015 г. |
| 3.4. | Урачыстыя мерапрыемствы, прысвечаныя Дню юнага героя-антыфашыста (дадатак 2, 3) | 8 лютага 2014 г., 8 лютага 2015 г. |
| 3.5. | Конкурс піянерскіх агітбрыгад «Запалі вогнішча дабрыні!» (дадатак 4) | 10 лютага 2014 г. |
| 3.6. | Акцыя «Да абароны Айчыны гатовы!» | 23 лютага 2014 г., 23 лютага 2015 г. |
| 3.7. | Інтэрнэт-віктарына “Перагортваючы старонкі гісторыі Зэльвеншчыны” (дадатак 5) | Люты 2014 г. |
| 3.8. | Стварэнне на сайце ДУА «Цэнтр творчасці дзяцей і моладзі г.п. Зельва» відэастаронкі «Жывыя галасы гісторыі» | Сакавік 2014 г. |
| 3.9. | Плэнэр, прысвечаны Дню Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне «Подзвігу народа прысвячаецца» (дадатак 6) | Красавік 2014 г. |
| 3.10. | Акцыя «Дзякуй за Перамогу!» | Красавік – май 2014 г., 2015 г. |
| 3.11. | Вахта Памяці | 9 мая 2014 г., 2015 г. |
| 3.12. | Акцыя “Квітней, Беларусь!” | Май 2014 г. |
| 3.13. | Арганізацыя профільных патрыятычных змен на базе ДУ ”Зэльвенскі раённы аздараўленчы лагер “Бакітная хваля” | Лета 2014 г., лета 2015 г. |

| | | |
|---|---|---|
| 3.14. | Злёт раённай піянерскай арганізацыі “Ветразь”, прысвечаны 70-й гадавіне вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў | 17 мая 2014 г. |
| 3.15. | Спартыўна-патрыятычная гульня «Зарніца» | Май 2014 г. |
| 3.16. | Праект «Лета па-піянерскі – 2014» па прывядзенні ў парадак помнікаў і пахаванняў воінаў, загінуўшых у гады Вялікай Айчыннай вайны і аказанню шэфскай дапамогі ветэранам | Чэрвень – жнівень 2014 г. |
| 3.17. | Агляд-конкурс знамённых груп «Раўненне на сцяг!» | 29 кастрычніка 2014 г. |
| 3.18. | Конкурс “Ніколі не забудзем: унукі пра вайну” (дадатак 7) | Кастрычнік 2014 г. |
| 3.19. | Інтэлектуальна-творчая гульня «Пароль – акцябронак: маленькія зорачкі вялікай краіны» | Кастрычнік 2014 г. – красавік 2015 г. |
| 3.20. | Акцыя “Цуды на Каляды” | Снежань - студзень 2014 г., 2015 г. |
| 3.21. | Адукацыйны праект «Зброя Перамогі» (дадатак 8) | 2014 г., 2015 г. |
| 3.22. | Удзел у мерапрыемствах рэспубліканскай патрыятычнай акцыі «Жыву ў Беларусі і тым ганаруся” | 2014 г., 2015 г. |
| 3.23. | Рэалізацыя мерапрыемстваў праекта “400 спраў – не мяжа” | 2014 г., 2015 г. |
| 3.24. | Удзел у мерапрыемствах абласнога мегапраекта “Патрыятычны марафон сацыяльна значных спраў «Паклонімся вялікім тым гадам» | 2014 г., 2015 г. |
| 3.25. | Піянерскі марафон «Салют піянерскаму папаўненню!» (урачысты прыём у піянеры) | 2014 г., 2015 г. |
| 2.26. | Рэкламная кампанія «Піянерыя: гісторыя і сучаснасць» | |
| 3.27. | Падвядзенне прамежкавых вынікаў аб рэалізацыі праекта | Студзень 2015 г. |
| 3.28. | Агляд-конкурс дзіцячай творчасці «Прывітанне, свет!», прысвечаны 70-й гадавіне Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне | Студзень – люты 2015 г. |
| 3.29. | Інтэрнэт-конкурс «Гродзенская мыш» | Люты – сакавік 2015 г. |
| 3.30. | Выстава-конкурс дзіцячага малюнка «Партрэт ветэрана» | Люты – сакавік 2015 г. |
| 3.31. | Конкурс ДПТ «І ўнукі ўслаўляць радасць Перамогі» | Люты – сакавік 2015 г. |
| 3.32. | Конкурс дзіцячых работ «Тут усе свае» | Люты – сакавік 2015 г. |
| 3.33. | Выстава-конкурс дэкаратыўна-прыкладной творчасці «Галерэя дасягненняў», прысвечаная 70- | Сакавік – снежань 2015 г. |

| | | |
|---|---|---|
| | годдзю Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне і Году моладзі | |
| 3.34. | Спартыўна-патрыятычная гульня «Зарнічка» | Красавік 2015 г. |
| 3.35. | Відэавіншаванне «Дзе ж вы, сябры-аднапалчане?» | Красавік – май 2015 г. |
| 3.36. | Флэш-моб «Свечкі памяці – свечкі Перамогі» | 9 мая 2015 г. |
| 3.37. | Акцыя «Ваша перамога – наша свабода» па прывядзенні ў парадак помнікаў і пахаванняў воінаў, загінуўшых у гады Вялікай Айчыннай вайне і аказанні шэфскай дапамогі ветэранам | Чэрвень – жнівень 2015 г. |
| 3.38. | Асвятленне работы па рэалізацыі праекта ў сродках масавай інфармацыі і на сайце ўстаноў адукацыі | 2014 г., 2015 г. |
| 3.39. | Маніторынг рэалізацыі праекта | 2014 г., 2015 г. |
| **4.** | **Аналітычны** | |
| 4.1. | Падвядзенне вынікаў, складанне аналітычнай інфармацыі па выніках | Лістапад 2015 г. |
| **5.** | **Заключны** | |
| 5.1. | Падвядзенне вынікаў праекта | Снежань 2015 г. |
| 5.2. | Распрацоўка і выданне зборніка з вопыту работы па рэалізацыі праекта | Снежань 2015 г. |

## Практычны аспект рэалізацыі праекта

На сучасным этапе школа не можа ў поўнай меры вырашыць праблемы выхавання дзяцей, паколькі яна арыентавана, перш за ўсё, на навучанне, падрыхтоўку дзяцей да паступлення ў вышэйшыя навучальныя ўстановы. У сям'і, непасрэдны абавязак якой – выхаванне дзяцей, дамінуючай мэтай сёння з'яўляецца фінансавае забеспячэнне больш ці менш годнага існавання. Кампенсуючую функцыю выхавання ў сучасных умовах выконваюць установы дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі, паколькі сацыяльнае асяроддзе гэтых устаноў у большай ступені садзейнічае выхаванню асобы, і як нідзе больш выхаваўчы і адукацыйны працэс ва ўстановах дадатковай адукацыі двуадзіны.

На тэрыторыі Зэльвенскага раёна такая роля належыць дзяржаўнай установе адукацыі "Цэнтр творчасці дзяцей і моладзі г.п. Зэльва".

Багаты патэнцыял для выхавання любові да сваёй Айчыны маюць выхаваўчыя мерапрыемствы, выставы, фестывалі і конкурсы, традыцыйныя святы і конкурсы па патрыятычнай тэматыцы. Паказчыкам эфектыўнасці такога выхавання з'яўляецца фарміраванне і развіццё ў дзяцей сацыяльнай актыўнасці, якая праяўляецца ў сацыяльных і грамадзянскіх акцыях міласэрнасці.

У ходзе рэалізацыі *праекта "Памяць аб вайне адгукаецца ў сэрцы"* на працягу 2014 г. - пачатку 2015 г. прайшоў шэраг мерапрыемстваў.

У студзені - маі 2014 г., а затым у верасні - снежні 2014 г. прайшла працоўная акцыя па зборы другаснай сыравіны "Наша піянерская праца табе, Айчына". У акцыі прынялі ўдзел 11 піянерскіх дружын, было сабрана 2237,2 кг макулатуры, 39 кг пластыкавых бутэлек. Атрыманыя грашовыя сродкі (890650 бел. руб.) пералічаны на рэканструкцыю сквера імя піянера-героя Марата Казея (г. Мінск). Па выніках праведзеных этапаў лепшай стала піянерская дружына "Факел" (СШ № 2 г.п. Зэльва). Акцыя працягваецца да мая 2015 г.

На працягу 2014 - 2015 гадоў праходзіць раённая акцыя "Добрае сэрца" – ветэранам!" па аказанні шэфскай дапамогі ветэранам Вялікай Айчыннай вайны сіламі цімураўскіх і валанцёрскіх атрадаў. Мэта акцыі – аказанне практычнай дапамогі ў вырашэнні актуальных сацыяльна значных спраў ветэранам Вялікай Айчыннай вайны; прыцягненне большай колькасці навучэнцаў у добраахвотны ўдзел у сацыяльна значных справах; прапаганда і распаўсюджванне пазітыўных ідэй добраахвотнага служэння грамадству.



Фота 1. Члены цімураўскага атрада дамапагаюць у нарыхтоўцы паліва

Штомесяц членамі цімураўскіх і валанцёрскіх атрадаў праводзіцца актуалізацыя банка? ветэранаў ВАв, замацаваных за ўстановамі адукацыі.

Ва ўстановах адукацыі дзейнічае "Гарачая лінія Дабрыні", звярнуўшыся на якую ветэраны могуць атрымаць неабходную дапамогу. Так, па выніках зваротаў на "гарачую лінію", піянерскай дружынай "Віцязь" (СШ № 3 г.п.

Зэльва) была аказана дапамога ветэранам ВАв Жуку І.А, Скіба П.С., Заморскаму П.А., піянерскай дружынай “Спадчына” (Дзярэчынскі д/с-СШ) – аказана дапамога ветэрану Якушу І.С., дружынай “Каралінка” (Каралінская СШ) – Жывулька А.Е., дружынай “Мара” (гімназія № 1 г.п. Зэльва) – ветэрану ВАв Кашуткіну В.З., дружынай “Верасок” (Міжэрыцкі д/с-БШ імя У. Ляха) – аказана дапамога ветэрану педагагічнай працы Папковіч З.Н. Усе звароты тычацца дапамогі па ўборцы тэрыторыі каля дамоў, на агародзе, дапамогі ў загатоўцы паліва і г.д.

У ходзе акцыі ва ўстановах адукацыі праводзяцца Урокі Дабрыні (мэта – прапаганда ідэі добраахвотніцтва), напрыклад: “Валанцёры новага часу”, “Пульс планеты” (СШ № 3 г.п. Зэльва), “Дабрыня выратуе свет” (Дзярэчынскі д/с-СШ), “Мы павінны памятаць” (Цяглевіцкі д/с-СШ), “Вучымся быць талерантнымі” (Міжэрыцкі д/с-БШ імя У. Ляха).

Членамі цімураўскіх і валанцёрскіх атрадаў СШ № 2 г.п. Зэльва, Каралінскай СШ зроблены відэазапісы ўспамінаў ветэранаў ВАв Валюк Валянціны Мікалаеўны і Жывулька Аркадзія Емельянавіча аб падзеях ваенных часоў. Дадзеныя ўспаміны размешчаны на Інтэрнэт-сайце Цэнтра творчасці дзяцей і моладзі г.п. Зэльва (старонка “Жывыя галасы гісторыі”). Членамі піянерскай дружыны “Спадчына” (Дзярэчынскі д/с-СШ) запісаны відэаролік “Каб памяталі”.

Сустракаючыся з ветэранамі вайны, слухаючы іх успаміны, знаёмячыся з гісторыяй пасёлка, вёскі, з рэліквіямі народнага подзвіга, навучэнцы авалодваюць значным духоўным багаццем. Гэта садзейнічае фарміраванню ў іх высокай патрыятычнай свядомасці і грамадзянскай кампетэнтнасці асобы.

У рамках акцыі “Дом без адзіноты” членамі піянерскіх дружын і пярвічных арганізацый грамадскага аб’яднання “Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі” праводзяцца віншаванні ветэранаў ВАв, ветэранаў працы, адзінока пражываючых грамадзян з днямі нараджэння, памятнымі датамі і дзяржаўнымі святамі.



Фота 2. У час Параду 9 мая

У рамках эстафеты “Запалі факел душы”, удзельнікамі якой стала больш за 600 членаў дзіцячых і маладзёжных грамадскіх арганізацый, ва ўстановах адукацыі прайшлі сустрэчы з ветэранамі Сяляўка М.І., Сталпец Л.І. (СШ № 2 г.п. Зэльва), сустрэчы-ўспаміны “Пакуль жыву – памятаю” (Каралінская СШ), мітынгі-рэквіемы “Мы памятаем ваш подзвіг, салдаты вайны” (СШ № 2 г.п. Зэльва, гімназія № 1 г.п. Зэльва, Цяглевіцкі д/с-СШ, Міжэрыцкі д/с-БШ імя У. Ляха, Князеўская гімназія, Ялуцавіцкі д/с-БШ, Галынкаўская СШ).

Валанцёрамі і цімураўцамі праведзены працоўныя дэсанты “Чыстыя вокны і кватэры”, аказана дапамога 12 ветэранам і прэстарэлым грамадзянам па

уборцы дамоў і кватэр, мыццю вокнаў (Каралінская СШ, Елкаўская СШ, Цяглевіцкі д/с-СШ, Міжэрыцкі д/с-БШ імя У. Ляха).

Адноўлены шыльды і чырвоныя зоркі на дамах ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны (15 чалавек), члены цімураўскага атрада СШ № 2 г.п. Зэльва разам з чырвонымі зоркамі прымацавалі шыльды “Дзякуй за Перамогу!”.

Ход акцыі “Добрае сэрца” – ветэранам” асвячаецца на старонках раённай газеты “Праца” (“Жывы сведка гістарычных падзей”, “Прыклад патрыятызму” – СШ № 2 г.п. Зэльва).

Развіццю інтэлектуальных здольнасцей, павышэнню ўзроўню ведаў аб нацыянальнай гісторыі, геаграфіі, культуры спрыяе і правядзенне інтэлектуальных гульняў. Так, 11 студзеня 2014 г. адбыўся чэмпіянат па інтэлектуальных гульнях сярод піянерскіх дружын “Мая Радзіма – Беларусь”, у якім прынялі ўдзел 10 каманд (60 чалавек). Лепшымі сталі каманды піянерскіх дружын “Віцязь” (СШ № 3 г.п. Зэльва) і “Каралінка” (Каралінская СШ).



Фота 3. Пераможца агляду-конкурсу агітбрыгада піянерскай дружыны “Віцязь”

8 лютага традыцыйна прысвячаецца Дню юнага героя-антыфашыста. Ва ўстановах адукацыі прайшлі ўрачыстыя лінейкі “Жывём і памятаем”. Прайшло пасяджэнне РС ГА “БРПА” “Дыялог пакаленняў”. 9 устаноў адукацыі прынялі ўдзел у Інтэрнэт-віктарыне “Юныя піянеры героі-антыфашысты”. Члены піянерскіх дружын Князеўскай гімназіі, Галынкаўскай СШ і Елкаўскай СШ прынялі ўдзел у піянерскім вернісажы “Героі ніколі не паміраюць. Героі ў нашай памяці жывуць”. Ход мерапрыемстваў асвячаўся на старонках раённай газеты “Праца” (артыкул “Выхаванне на прыкладзе герояў”, Галынкаўская СШ, Міжэрыцкі д/с-БШ імя У. Ляха).

У мэтах фарміравання духоўна-маральнай і грамадзянска-патрыятычнай культуры падрастаючага пакалення 10 лютага 2014 г. 8 устаноў адукацыі прынялі ўдзел у аглядзе-конкурсе піянерскіх агітбрыгад “Запалі вогнішча дабрыні”.



Фота 4. Сустрэча з работнікамі РАНС

Штогод у лютым праводзяцца сустрэчы з удзельнікамі ваенных падзей, з ветэранамі Вялікай Айчыннай вайны. Гэта не пасіўнае слуханне ўспамінаў дарослых, усе прысутныя – актыўныя ўдзельнікі сустрэч.

Да Дня абаронцаў Айчыны і Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь прайшлі мерапрыемствы ў рамках аперацыі “Гордасць”, удзел у якіх прыняло больш за 500 навучэнцаў устаноў адукацыі раёна. 23 лютага 2014 г. ва ўстановах адукацыі праводзілася работа па рэалізацыі

мерапрыемстваў Рэспубліканскай акцыі “Да абароны Айчыны гатовы!”. У акцыі прынялі ўдзел 9 устаноў адукацыі. З мэтай азнаямлення з умовамі паступлення і навучання ў навучальных установах МНС у гімназіі № 1 г.п. Зэльва, Князеўскай гімназіі, Каралінскай СШ прайшла сустрэча дапрызыўнай моладзі з работнікамі раённага аддзела па надзвычайных сітуацыях.





Фота 5, 6. У час мерапрыемства “Служыць Айчыне гатовы!”

У Галынкаўскай СШ і Міжэрыцкім д/с-БШ імя У. Ляха прайшоў конкурс па зборцы і стральбе з вінтоўкі. У ходзе сустрэчы з работнікамі Зэльвенскага ваенкамата навучэнцы Каралінскай СШ даведаліся аб станаўленні і традыцыях Узброеных сіл Рэспублікі Беларусь. У Елкаўскай СШ прайшоў конкурс вершаў “Айчыны годныя сыны”. У гімназіі № 1 г.п. Зэльва, Князеўскай гімназіі, Галынкаўскай СШ, Каралінскай СШ, Цяглевіцкім д/с-СШ, Дзярэчынскім д/с-СШ, Ялуцавіцкім д/с-БШ былі арганізаваны спартландыі і спартыўна-гульнёвыя праграмы. У Дзярэчынскім д/с-СШ адбылася сустрэча навучэнцаў выпускных класаў з прадстаўнікамі Гомельскага інжынернага інстытута МНС Рэспублікі Беларусь, а таксама мітынг, прысвечаны памяці Героя Савецкага Саюза Казбека Нуржанава “Два народа – адна памяць” (дадатак 9).

У ходзе акцыі “Падарунак ветэрану” піянеры Галынкаўскай СШ, Цяглевіцкага д/с-СШ зрабілі і ўручылі сувеніры ветэранам ВАв.

Гімназія № 1 г.п. Зэльва і Князеўская гімназія ўдзельнічалі ў раённых спаборніцтвах “Снежны снайпер”.

Конкурс патрыятычнай песні “Рыо-Рыта!” прайшоў у Галынкаўскай СШ.







Фота 7, 8, 9. У час плэнэра

На базе ДУ “Зэльвенскі раённы аздараўленчы лагер “Блакітная хваля” праводзілася спартыўна-гульнёвая праграма “Служыць Айчыне гатовы!”. У мерапрыемстве прынялі ўдзел 97 навучэнцаў з 9 устаноў адукацыі.

26 красавіка 2014 г. прайшоў раённы плэнэр, прысвечаны Дню Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне “Подзвігу народа прысвячаецца…”. У плэнэры прынялі ўдзел 13 навучэнцаў з 7 устаноў адукацыі.

У межах рэалізацыі сацыяльна значнай ініцыятывы дзіцячых і маладзёжных арганізацый “400 спраў – не мяжа”, якая арганізавана з мэтай прыцягнення моладзі ў актыўныя формы грамадзянскага і духоўна-маральнага выхавання, развіцця сацыяльнай актыўнасці дзяцей, падлеткаў і моладзі ў снежні 2014 г. – студзені 2015 г. праводзіўся раённы этап рэспубліканскай акцыі ГА “БРСМ” і ГА “БРПА” “Цуды на Каляды”. Арганізатары ў рамках акцыі ставілі сваёй мэтай садзейнічанне выхаванню ў школьнікаў сацыяльнай актыўнасці, а таксама міласэрнасці і гатоўнасці прысці на дапамогу тым, хто ў ёй мае патрэбу. Чарговы раз у акцыі прынялі ўдзел больш за тысячу неабыякавых школьнікаў. Ва ўстановах адукацыі былі арганізаваны дабрачынныя кірмашы, за атрыманыя сродкі (каля 8 мільёнаў рублёў) скамплектавана 269 падарункаў.




Фота 10. Сімвал акцыі – “Чырвоная рукавічка”

Аперацыі “Свята ў кожны дом” і “Навагодні сюрпрыз”, забаўляльная праграма “Навагодняя казка”, акцыя “Дом без адзіноты”, сімвалам якіх стала “Чырвоная рукавічка”, што атаясамлівае імкненне дзяцей і моладзі агарнуць клопатам і ўвагай людзей, якія гэтага патрабуюць, прайшлі ва ўсіх піянерскіх дружынах і пярвічных арганізацыях ГА “БРСМ”.

“Чырвоныя рукавічкі”, укамплектаваныя школьнымі прыладамі, цацкамі і салодкімі падарункамі, члены арганізацый перадалі выхаванцам сацыяльна-педагагічнага цэнтра і цэнтра карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі. Падарункі таксама атрымалі дзеці-інваліды, сіроты і дзеці са шматдзетных сем’яў.





Фота 11, 12. Віншаванне і ўручэнне падарункаў выхаванцам СПЦ

Таксама актывісты наведалі педыятрычнае аддзяленне раённай бальніцы, а яшчэ павіншавалі з Калядамі і Новым годам ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны і ветэранаў педагагічнай працы.

З мэтай фарміравання ў дзяцей і падлеткаў устойлівага жадання садзейнічаць росквіту краіны і яе абараняць, у маі 2014 г. праводзілася раённая ваенна-патрыятычная гульня “Зарніца”, удзел у якой прынялі 48 навучэнцаў з 7 устаноў адукацыі.





Фота 13, 14. У час “Зарніцы”

У мэтах выхавання ў моладзі нацыянальнай і грамадзянскай самасвядомасці, павагі да гісторыі, гераічнага мінулага сваёй Радзімы, да подзвігаў ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, развіцця актыўнай грамадзянскай пазіцыі, павышэння значэння Перамогі ў гісторыі беларускага народа, яе ўплыву на фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці, адносін маладых людзей да падзей тых гадоў з 30 красавіка па 9 мая 2014 г. праводзіўся раённы этап рэспубліканскай патрыятычнай акцыі “Дзякуй за Перамогу!”.






Фота 15, 16. У час акцыі “Дзякуй за Перамогу!”

У акцыі прынялі ўдзел 567 членаў піянерскіх дружын і ПА ГА “БРСМ”. 30 красавіка старт акцыі даў марафон “Дарогай памяці”, у рамках якога быў праведзены працоўны дэсант па добраўпарадкаванні месцаў увекавечвання памяці герояў ВАв.

Таксама ў гэты дзень ва ўсіх піянерскіх дружынах былі запушчаны ў неба паветраныя змеі з надпісам “Імёны герояў жывуць у нашых сэрцах і ў аблоках!”.



Фота 17. Працоўны дэсант

7 мая 2014 г. адбыўся марафон “Ад помніка да помніка!”, у час якога адбываліся мітынгі “Каб памяталі!”. На мітынгу ў Галынкаўскай СШ прайшоў прыём у акцябраты і піянеры, урачыста ўручаны білеты членаў ГА “БРСМ”.

З 30 красавіка па 8 мая 2014 г. ва ўстановах адукацыі прайшлі аперацыі “Зорачка”, “Дзякуй за Перамогу!”, “Пісьмо ветэрану”, “Падарунак ветэрану”, працоўны дэсант “Чысты дом”, пад час якіх былі адноўлены чырвоныя зоркі на дамах ветэранаў (33), зроблены значкі з надпісам “Дзякуй за Перамогу!” (33) і прымацаваны на дзверы дамоў ветэранаў. Піянерамі зроблены 20 паштовак, 13 памятных сувеніраў і уручаны ўсім ветэранам ВАв, якія пражываюць на тэрыторыі Зэльвенскага раёна (33 чалавекі).







Фота 18, 19, 20 . Прыём у члены ГА “БРПА” і ГА “БРСМ”

23 ветэранам аказана дапамога па прыбіранні дамоў. 7-9 мая каля памятных месцаў выстаўлены ганаровы каравул. 9 Мая членамі Маладзёжнага парламента ў 21$^{00}$ гадзін у пасёлку быў арганізаваны флэш-моб “Добрае сэрца” – ветэранам!”, удзел у якім прынялі 115 чалавек (навучэнцы, жыхары і госці пасёлка).



Фота 21. Аперацыя “Пісьмо ветэрану”

У мэтах выхавання ў моладзі нацыянальнай грамадзянскай самасвядомасці, фарміравання ў моладзі любові да Радзімы, умацавання грамадзянскай пазіцыі, пачуцця патрыятызму з 11 па 12 мая 2014 г. члены піянерскіх дружын і ПА ГА “БРСМ” прынялі ўдзел у рэспубліканскай акцыі “Квітней, Беларусь!”, прысвечанай Дню Дзяржаўнага герба і сцяга Рэспублікі Беларусь. 11 мая старт акцыі даў раённы мітынг. У рамках акцыі прайшоў святочны канцэрт, у якім прынялі ўдзел 56 членаў ГА “БРСМ” і ГА “БРПА”.

Працавалі гульнявыя пляцоўкі. Ва ўсіх установах адукацыі адбылося ўрачыстае падняцце сцяга Рэспублікі Беларусь, прайшлі таксама ўрачыстыя лінейкі, прысвечаныя Дню Дзяржаўнага герба і сцяга Рэспублікі Беларусь, тэматычныя часы інфарміравання "Сімвалы нашай Радзімы", інтэлектуальны турнір "Сімволіка нашай краіны – горада – школы", віктарына "Сімвалы Беларусі", вусны часопіс "Сімволіка Рэспублікі Беларусь", Дзень здароўя.







Фота 18, 19, 20. У час акцыі "Добрае сэрца" – ветэранам"

Станаўленню грамадзянскай пазіцыі навучэнцаў садзейнічае такая форма работы, як арганізацыя профільных патрыятычных змен на базе ДУ "Зэльвенскі раённы аздараўленчы лагер "Блакітная хваля". Летам 2014 г. рэалізоўваўся праект "Каб любіць Беларусь нашу мілую…". У рамках праекта дзеці завочна падарожнічалі па сваёй малой радзіме. Галоўная мэта праекта – стварэнне ўмоў для фарміравання ў дзяцей і падлеткаў грамадзянска-патрыятычных пачуццяў і адказнасці за захаванне гісторыка-культурнай спадчыны роднай краіны.

У мэтах патрыятычнага выхавання навучэнцаў, пашырэння ведаў аб гістарычных падзеях Вялікай Айчыннай вайны, развіцця творчых здольнасцей у сакавіку - красавіку 2014 г. праводзіўся раённы этап абласнога адукацыйнага праекта "Зброя Перамогі". У абласным конкурсе работа Каўчуна Дзмітрыя (Елкаўская СШ) заняла 3-е месца.

Заключэнне

Аналіз прамежкавых вынікаў па рэалізацыі праекта дазваляе зрабіць наступныя высновы:

– удзел навучэнцаў у сацыяльных і грамадзянскіх акцыях міласэрнасці, традыцыйных святах, мерапрыемствах і разнастайных творчых конкурсах садзейнічае станаўленню іх грамадзянскай пазіцыі;

– актыўна адраджаецца склаўшаяся ў папярэднія гады сістэма форм і метадаў грамадзянскага выхавання, разуменне неабходнасці выхавання гістарычна граматнага грамадзяніна;

– сфарміравана асяроддзе выхавання і навучання для навучэнцаў па вывучэнню гістарычных падзей;

– ствараюцца і удасканальваюцца ўмовы для развіцця творчай асобы;

– узровень сфарміраванасці грамадзянска-патрыятычных, маральных якасцей асобы навучэнцаў значна вырас;

– павялічыўся масавы ахоп навучэнцаў у мерапрыемствах патрыятычнага накірунку.

Работу па рэалізацыі праекта ў далейшым неабходна накіраваць на фарміраванне *ўсвядомленага* стаўлення да Айчыны, яе мінулага, сучаснага і будучага на аснове гістарычных каштоўнасцей і ролі Рэспублікі Беларусь ў лёсах свету; стварэнне ўмоў для рэалізацыі кожным навучэнцам асабістай грамадзянскай пазіцыі.

Літаратура


1. Бабосов, Е.М. Основы идеологии современного государства / Е.М. Бабосов. – Минск : ТетраСистемс, 2004. – 210 с.
2. Бедулина, Г.Ф. Идейно-воспитательное пространство учреждения образования / Г.Ф. Бедулина // Праблемы выхавання. – 2006. – № 4. – С.27–31.
3. Гоцман, А.М. Влияние детских и молодёжных организаций на формирование активной гражданской позиции / А.М. Гоцман // Праблемы выхавання. – 2009. – № 3. – С.30–37.
